Вольга Коваль

старшы выкладчык кафедры
гісторыі Беларусі і паліталогіі
УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук
(г. Мінск, Беларусь)

# Тэатральнае мастацтва беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд

Спадчына беларускай эміграцыі з'яўляецца важнай складаючай часткай гісторыі Бацькаўшчыны. Мінулае замежжа прадстаўлена яскравымі старонкамі развіцця музычнага, тэатральнага, выяўленчага мастацтва, фарміраваннем выдавецкай справы за мяжой, арганізацыяй культурных установаў і цэнтраў. Захаванне нацыянальных культурных традыцый у розных краінах свету спрыяла фарміраванню нацыянальнай ідэнтычнасці ўсёй беларускай дыяспары.



Варта падкрэсліць, што беларусы замежжа не толькі задавальнялі ўласныя культурныя патрэбы, а яшчэ вялі нацыянальную прапаганду ў асяродку прымаючага грамадства. Культура замежжа садзейнічала кансалідацыі дыяспары ў іншамоўным соцыуме, спрыяла індывідуальнай псіхалагічнай адаптацыі.

У міжваенны перыяд пачынаецца працэс фарміравання беларускай дыяспары, ствараюцца нацыянальныя палітычныя цэнтры, узнікаюць грамадскія арганізацыі і аб'яднанні. Асноўная эміграцыйная хваля была накіравана ў краіны Еўропы, у міжваенны час беларусы таксама ехалі ў краіны Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Большасць эмігрантаў сталі прадстаўнікамі эканамічнай хвалі, якія адпраўляліся за мяжу ў пошуках заробкаў, некаторыя марылі пасля вярнуцца на Бацькаўшчыну з уласным капіталам.

Сярод еўрапейскіх культурных асяродкаў замежжа вылучаецца Латвія і Чэхаславакія, дзе на пачатку 1920-х гг. асабліва плённа развівалася адукацыя, выдавецкая справа, музычнае і тэатральнае жыццё беларускай эміграцыі. Адметнай рысай дзейнасці беларусаў у названых краінах стала актыўнасць прадстаўнікоў беларускай эміграцыі.

У Латвіі паспяхова дзейнічалі Дзвінская дзяржаўная беларуская гімназія, Люцынская беларуская гімназія, Рыжская беларуская школа для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарослых, беларускія настаўніцкія курсы [3, *115*]. Беларускія гімназіі ў Дзвінску і Люцыне былі адчынены ў пачатку 1922—1923 навучальнага года.

Найбольш вядомай і прэстыжнай беларускай сярэдняй навучальнай установай у Латвіі стала дзяржаўная гімназія ў Дзвінску, якая давала вучням высокі культурны і выхаваўчы ўзровень, а яе дзіцячыя творчыя калектывы мелі выключны поспех на лепшых сцэнах Рыгі. Педагогі гімназіі пад кіраўніцтвам вядомага вучонага І. І. Краскоўскага (дырэктар і арганізатар установы) распрацавалі і ўдала рэалізавалі ўласную сістэму фарміравання асобы, якая абапіралася не толькі на тэарэтычныя веды, але і на працоўнае выхаванне моладзі.

Драматычны гурток у гімназіі ўзначальвала Паўліна Мядзёлка (сябра Я. Купалы), якая нярэдка выступала ў пастаноўках разам з вучнямі. Напрыклад, у снежні 1923 г. на сцэне Дзвінскай гімназіі была пастаўлена п'еса «Батлейка», у якой П. Мядзёлка выконвала песню «Не пагаснуць зоркі ў небе» [1, *4*]. Пастаноўка мела сапраўдную папулярнасць, таму вучні гімназіі яе выконвалі неаднаразова.

Кіраўніком драматычнага гуртка ў Люцынскай гімназіі стаў С. Казека. Вядома, што найбольшым поспехам у Люцыне карысталася п'еса «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча. Разам з тым, рэпертуар гімназіі быў значна шырэйшы. Адметнасцю тэатральнага жыцця ўстановы стаў свой вучнёўскі хор, які дастаткова прафесійна дапаўняў гульню акцёраў.

З пачатку 1920-х гг. у Латвіі пачалі ствараццa вандроўныя беларускія трупы са звычайных сялян з артыстычнымі здольнасцямі. Дапамагалі ў пастаноўках аматарам беларускія настаўнікі. Самым вядомым і папулярным стаў аматарскі тэатр у в. Шнёкава Прыдруйскай гміны. Рэжысёрам тэатра быў таленавіты вясковы настаўнік М. Талерка.

Тэатральнае жыццё беларусаў у Латвіі стала самым яскравым сярод эміграцыйных асяродкаў беларускага замежжа. У 1927 г. было створана Беларускае тэатральнае таварыства ў Латвіі, якое аб'ядноўвала аматарскія беларускія тэатры і дзіцячыя тэатральныя трупы гімназій. Па ініцыятыве таварыства ў 1928 г. быў адчынены Рыжскі беларускі народны тэатр. Адкрыццё тэатра ў Рызе мела прынцыповае значэнне для кансалідацыі беларускай дыяспары. Эміграцкі часопіс «Беларуская школа ў Латвіі» падкрэсліваў: «У дзень аткрыцьця Беларускага Народнага Тэатру ў Рызе, 24 сакавіка г. г., стаўлена была вядомая п'еса Янкі Купалы "Паўлінка". П'еса прайшла з добрым посьпехам: яна цэп-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ла спаткана латвійскай прэсай, якая апрача рэцэнзіяў зьмясьціла яшчэ і фатаграфіі артыстаў, і асобныя сцэны; яна зрабіла добрае ўражаньне на гледачоў, сярод якіх было шмат гасьцей іншых нацыянальнасьцяў, яна паказала, нарэшце, якія багатыя сцэнічныя магчымасьці закладзены ў беларускіх п'есах, і як ярка могуць быць выяўлены на сцэне пры належным мастацкім кіраўніцтве» [2, *122*]. Першым рэжысёрам Рыжскага беларускага тэатра стаў Ян Шабэрт, які вучыўся тэатральнаму мастацтву ў самога К. С. Станіслаўскага. Вядома, што рэжысёры тэатра хутка мяняліся па прычыне матэрыяльных цяжкасцей трупы. Асноўнай праблемай тэатра быў звычайны недахоп грошай.

Безумоўна, Латвія стала важным палітычным цэнтрам для беларускай дыяспары ў пачатку міжваеннага перыяду. Аднак ужо ў 1930-я гг. найбольш актыўныя палітычныя дзеячы выязджаюць з краіны ў пошуках лепшых умоў жыцця і працы, па гэтай прычыне заціхае і тэатральнае жыццё.

Культурныя ўзаемасувязі спрыялі фарміраванню сталых кантактаў з іншымі дыяспарамі, мова і традыцыі якіх былі блізкімі і падобнымі. Напрыклад, у міжваенны час беларуская эміграцыі развівала актыўнае супрацоўніцтва з украінскай дыяспарай. Супольныя беларуска-ўкраінскія праекты былі рэалізаваны таксама ў тэатральным мастацтве.



Беларускія і ўкраінскія аматарскія калектывы абменьваліся вопытам, тэатральныя гурткі дапамагалі ў арганізацыі спектакляў, у пошуку залаў і ў музычным суправаджэнні. Яскравым прыкладам тэатральных узаемакантактаў з'яўляецца дзейнасць беларускага Музыкальна-драматычнага гуртка ў Чэхаславакіі.

У 1923 г. пры Беларускай грамадзе быў арганізаваны Музыкальна-драматычны гурток, які ў 1924 г. пачаў называцца Драматычным гуртком пры Беларускай Радзе ў Празе [5, *3*]. Аматарскі калектыў першым у Чэхаславакіі пачаў пастаноўку музыкальных спектакляў на беларускай мове. Прэм'ерай драматычнага гуртка стала аперэта Ф. Аляхновіча «Птушка шчасця». Нацыянальнае тэатральнае мастацтва, на думку членаў гуртка, павінна было прыцягнуць да сябе ўвагу розных плыняў эмігрантаў, аб'яднаць беларускую супольнасць замежжа адзінай ідэяй прапаганды роднай культуры, паспрыяць актывізацыі дзейнасці ўсёй дыяспары, злучыць канфліктуючыя бакі эміграцыі.

Упершыню аперэту ў трох дзеях «Птушка шчасця» беларускія аматарскія акцёры паказалі ў 1924 г. у Празе на сцэне тэатра ўкраінскага лагера для эмігрантаў Йозэфове. Беларускі спектакль быў надзвычай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цёпла ўспрыняты мясцовай украінскай і чэшскай публікай: «Усюды прадстаўнікоў драматычнага гуртка спаткаў вельмі прыхільны прыём і было выказана пажаданьне, каб гурток прыязджаў з беларускімі пастаноўкамі часьцей» [4, *4*]. Выканаўцы вядучых персанажаў аперэты ўпершыню паспрабавалі сябе ў якасці акцёраў, бо ўсе яны былі аматарамі, а не прафесійнымі артыстамі. Разам з тым у водгуках на пастаноўку драматычнага гуртка «Птушка шчасця» падкрэсліваўся поспех акцёрскіх дэбютаў.

Значную творчую падтрымку беларускія выканаўцы атрымалі ад украінскіх эмігрантаў, бо музычнае суправаджэнне для аперэты падрыхтаваў украінскі аркестр. «Украінскі табаровы аркестр вельмі добра разыграў усе матывы п'есы, якія мастацка аркестраваў п. Баран», — пісала віленская газета «Сялянская праўда» [4, *4*]. Наступны раз пастаноўку паказалі таксама ў Празе ў вялікай зале «Мяшчанскай бяседы», пасля чаго аперэту зноў прадставілі на ўкраінскай сцэне ў Падэбрадах (на сцэне ўкраінскага інстытута). Гледачамі музычнага спектакля былі не толькі беларускія, але і шматлікія ўкраінскія эмігранты, якія шчыра дапамагалі ў падрыхтоўцы прэм'еры, давалі памяшканне, рабілі акампанемент, дапамагалі ў распаўсюджванні квіткоў. У супольных тэатральных праектах вялікую ролю мела падабенства моў, бо ўкраінскія гледачы замежжа маглі добра разумець беларускія словы і песні.



Культурнае жыццё беларускага замежжа развівалася не толькі ў краінах Еўропы, яго адметныя рысы можна вылучыць у дзейнасці беларусаў ЗША, Канады, Аргенціны і Бразіліі. Большасць беларусаў Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі сталі эканамічнымі эмігрантамі, таму іх дзейнасць не заўсёды была накіравана на захаванне гістарычнай памяці. Разам з тым творчасць дапамагала асобам не губляць веру ў лепшую будучыню, спрыяла псіхалагічнаму камфорту, душэўнай раўнавазе і працэсу сацыялізацыі.

Асабліва актыўнай працай у Аргенціне вызначалася беларускае таварыства «Культура», якое прапагандавала ў эміграцкім асяродку беларускую мову, ладзіла спектаклі і курсы. Творчыя вечарыны з тэатральнымі пастаноўкамі праводзіў Беларускі нацыянальны камітэт у Злучаных Штатах Амерыкі, аднак мерапрыемствы мелі нерэгулярны характар.

Такім чынам, тэатральнае мастацтва беларускай дыяспары — адна з яскравых тэм гісторыі развіцця культурнай самабытнасці замежжа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Супольныя міжнародныя праекты эмігрантаў сведчаць пра актыўны міжкультурны дыялог у перыяд станаўлення і развіцця беларускай дыяспары. Факты стварэння тэатральных беларускамоўных цэнтраў дэманструюць патрэбу прадстаўнікоў міжваеннай эміграцыйнай хвалі ў захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці на прасторы іншакультурнай супольнасці.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Беларусы ў Латвіі // Змаганьне. — Вільня, 1924. — № 10.
2. *Кастусёнак.* Беларускі Народны Тэатр у Рызе / Кастусёнак // Беларуская школа ў Латвіі. — Рыга, 1928. — № 8.
3. Коваль, *В. У.* Узаемасувязі беларускай і ўкраінскай дыяспар у міжваенны перыяд / В. У. Коваль. — Мінск : РІВШ, 2012. — 314 с.
4. *Ш-ло, Л.* Беларускі спэктакль у Юзэфове / Л. Ш-ло // Сялянская праўда. — Вільня, 1924. — № 20. — С. 4.
5. *Шышла.* Замежнае жыцьцё беларусаў / Шышла // Сялянская праўда. — 1924. — № 6. — С. 3.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ